

АНАМАЛЬНАЯ ЦЕПЛЫНЯ 7



СТАЦЬ МЕСЦАМ ЛЮБОВІ І МІРУ 8


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

19 ВЕРАСНЯ 2023 г. АЎТОРАК

№ 181 (30061)

# ЗВЯЗДА


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# БЕЛАРУСЬ — ГЭТА МЫ!

## Краіна адзначыла адно з найважнейшых свят – Дзень народнага адзінства

## «АДЗІНСТВА ДЛЯ НАС — ГАЛОЎНАЯ ЎМОВА ЗАХАВАННЯ І ЖЫЦЦЯ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ. А ЗНАЧЫЦЬ, ПЫТАННЕ ВЫЖЫВАННЯ НАС ЯК НАЦЫІ»

### Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на патрыятычным форуме «Мы — беларусы!», прысвечаным Дню народнага адзінства



Фота БелТА.

Дарагія суайчыннікі!

Сёння 17 верасня — Дзень народнага адзінства. Нашага адзінства, адзінства беларускага народа, сімвалам якога стаў 1939 год — год уз'яднання беларускіх зямель у межах адзінай дзяржавы.

Сам час, час глабальнага перадзелу свету, вярнуў гэту дату ў наш каляндар дзяржаўных свят.

Чым больш мы бачым, як разбураюцца сучасныя дзяржавы, як народы страчваюць радзіму, дом, традыцыі, — тым больш пільна ўглядаемся ў гісторыю роднай зямлі. Зямлі, якая тысячы гадоў таму сустрэла нашых старажытных продкаў суровым кліматам, навучыла трымацца разам, каб выжыць і стаць гаспадаром у сваім доме.

І мы разумеем, што па сутнасці няма новых выклікаў. Няма нечаканых паваротаў у гісторыі. Ёсць забытыя старыя ўрокі і пагрозы. І ёсць абарона — шматвяковы вопыт, які навучыў нас быць разам і ў шчаслівыя, і ў цяжкія часы.

На працягу многіх стагоддзяў беларусы былі адзіным цэлым: калі прымалі хрысціянства; калі трымалі ўдар германскага Тэўтонскага ордэна; калі змагаліся з французскай арміяй Напалеона; калі абаранялі свае веру, мову і культуру; калі ў адзіным парыве з братэрскімі савецкімі народамі стваралі аснову сваёй нацыянальнай дзяржаўнасці, паўставалі на барацьбу з фашысцкай агрэсіяй і адраджалі савецкую краіну з попелу Вялікай Айчыннай вайны.

І калі на абломках Савецкага Саюза пачалі будаваць суверэнную Беларусь.

Нам, беларусам, не трэба расказваць, як важна жыць у міры і згодзе, быць адзінай нацыяй. Жыццё навучыла нас.

І многае могуць расказаць нашы суайчыннікі, народжаныя пад польскай акупацыяй. Тыя, хто ведаюць пра небяспеку страціць Радзіму і адарвацца ад сям'і. Ведаюць, што значыць жыць на роднай зямлі, але быць ізгоем у вачах прывілеяваных суграмадзян на доўгія дзесяцігоддзі.

Яны разумеюць, чаму 17 верасня рэспубліка адзначала Дзень вызвалення працоўных Заходняй Беларусі ад польскіх паноў, ад акупацыі, ад прыгнёту. Як бы ні мянялася назва, яна аб'ектыўна адлюстроўвала сутнасць гэтага свята.

Яшчэ нядаўна мы амаль не ўспаміналі пра той драматычны час — перыяд расчлянення нашай Беларусі папалам! Усё адышло ў цень глабальнай трагедыі Вялікай Айчыннай вайны, Другой сусветнай вайны. Гэтая страшная чалавечая бойня перакрыла ўсё.

Гэты час не прынята было ўспамінаць у імя савецка-польскай дружбы, якая, як тады думалі, будзе вечнай.

Мы, беларусы, не кідалі суседзям абвінавачанні, але заўсёды памяталі: як у беларусаў забіралі школы, нашу веру, зямлю, прыродныя рэсурсы; як паміралі нашы продкі без медыцынскай дапамогі; як зневажалі і знішчалі маральна і фізічна ўсіх, хто быў адданы роднай культуры, веры, мове і традыцыям.

Хіба можна забыць, як з гармат стралялі па беларускіх вёсках, як білі розгамі беларускіх дзяцей у чужых школах, здзекаваліся з беларусаў, рускіх, украінцаў у польскім канцлагеры ў Бярозе-Картузскай? Гэта ўсё — факты.

Але дзеля дружбы з польскім народам мы пераступілі праз гэты боль.

За Бугам гэта палічылі за слабасць.

Але ўрок вывучаны.

Час паказаў, што наша высакароднае імкненне жыць у міры суседзі не ацанілі. Я не кажу пра польскі народ. Кажу пра эліты — палітыкаў, якія ўсе гэтыя гады прагнуць рэваншу.

Карыстаючыся выпадкам, хачу сказаць літаральна некалькі слоў сваім суседзям, а дакладней — народам суседніх краін: палякам, літоўцам, латышам. Ведайце! Мы не малюем планы ўмяшання ў ваша жыццё. Мы жадаем вам толькі дабра, шчасця і міру!

Але гэты мір сёння настолькі няўстойлівы, што любы неасцярожны рух можа прывесці да вельмі цяжкіх і непапраўных наступстваў. Вельмі не хацелася б, каб нашы землі чарговы раз сталі тэатрам ваенных дзеянняў і зноў былі б знішчаны мільёны нашых грамадзян, як гэта было заўсёды ў гісторыі.

Беларусам чужога не трэба. Пры гэтым памятайце (я звяртаюся да народаў суседніх дзяржаў): у выпадку агрэсіі супраць Беларусі мы не будзем маляваць ніякіх чырвоных, жоўтых, чорных або блакітных, на злобу, ліній! Яна ёсць, гэтая лінія — Дзяржаўная граніца! І вы ведаеце, што ў нас ёсць чым адказаць. Таму давайце жыць дружна, па-суседску, як гэта было ў лепшыя часы нашай гісторыі.

Але сёння па-над намі, як і напярэдадні Вялікай Айчыннай, кружаць сцярвятнікі. Кружаць вакол беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх зямель. Гатовыя хоць з д'яблам заключыць саюз, толькі б заняць больш месца на палітычнай карце свету... «Ад мора да мора».

І хацелі б назаўсёды сцерці з сусветнай гісторыі факты палітычнай ганьбы і маральнага падзення сваіх папярэднікаў. Самі хацелі б забыць, як афіцыйная суседка наша — Польшча — адна з першых прызнала нацысцкі рэйх (гэта факт), падпісала з ім дагавор аб ненападзенні і сакрэтнае пагадненне аб падзеле Чэхаславакіі; як, атрымаўшы частку чужой тэрыторыі, сама была раздаўлена на працягу кароткага часу сваім жа былым саюзнікам. Гэту старонку ў гісторыі ні ў якім разе нельга забываць нашым суседзям.

Засталася б наша суседка на карце свету ў прынцыпе, калі б не савецкія воіны? І калі так, то ў якіх межах?

Такім пытаннем улады нашых суседзяў сёння не задаюцца. І прадаўжаюць знішчаць сляды памяці аб сваіх вызваліцелях.

Але навошта? Іх няма, яны загінулі. Ну няхай вы не цэніце іх за вызваленне сваіх зямель. Але навошта варушыць старое? Няхай гэта, як ёсць, застанецца. Не. Трэба мячом і каўшом усё перакапаць, узарваць і знішчыць, сцерці з памяці тое найлепшае, што было ў гісторыі суседніх дзяржаў.

А мы зноў робім вывады.

Таму сёння, 17 верасня, у дзень пачатку лёсавызначальнага вызваленчага паходу Чырвонай Арміі мы адзначаем адно з самых галоўных дзяржаўных свят — Дзень народнага адзінства. Адзінства, загартаванага ў самаадданай барацьбе за сваю нацыянальную годнасць.

Мы ганарымся непахіснай воляй тых, хто не скарыўся антычалавечаму рэжыму. Тых, хто пайшоў у падполле, вёў вызваленчую партызанскую вайну, супраціўляўся палітыцы насільнай асіміляцыі.

Не было б такога маштабнага ўсенароднага супраціўлення — не было б уз'яднання беларускага народа ў 1939 годзе ў адзінай дзяржаве.

І не было б сучаснай суверэннай Беларусі, калі б не створаныя ўмовы для развіцця нашай нацыі ў сям'і савецкіх народаў.

Мы гэта ведаем. Мы гэта памятаем.

Як тады, так і сёння адзінства для нас... Адзінства для нас — галоўная ўмова захавання і жыцця нашай дзяржавы. А значыць, пытанне выжывання нас як нацыі.

Дзень 17 верасня — гэта адна з трох гістарычных дат разам з 9 Мая (Дзень Перамогі) і 3 ліпеня (Дзень Незалежнасці), якія даюць нам магчымасць азірнуцца ў мінулае, каб моцна трымаць у руках сваю сучаснасць і абараняць будучыню.

Гэтыя даты аб'ядноўваюць нас, сучасных беларусаў, у імкненні абараніць сваю гістарычную памяць у імя міру на роднай зямлі.

Яшчэ раз падкрэсліваю: мы не агрэсары. Наш народ па сутнасці не можа быць агрэсарам. Мы нікому не пагражаем і ніколі не будзем пагражаць. Гэта не наша палітыка. Ды і аб'ектыўна мы нікому не можам пагражаць.

Але сябе абараняць (моцныя мы, слабыя) мы абавязаныя. Гэта наша гістарычная роля, нашых пакаленняў, якія жывуць сёння ў Беларусі.

Таму, якія б унутрыпалітычныя падзеі ў нашых суседзяў ні адбываліся, народы (яшчэ раз паўтараю: палякі, літоўцы, латышы, украінцы) павінны разумець: мы самая міралюбная нацыя на Зямлі. Ні атамнай зброяй, ні нейкімі падраздзяленнямі, Вагнера і гэтак далей, мы не размахваем і нікому не пагражаем.

Але вы ж памятаеце гісторыю. Мы і тады нікому не пагражалі. Але нас сцерлі фактычна з зямлі. У апошняй вайне мы страцілі кожнага трэцяга. І тады бестурботнасць і самазаспакоенасць адыгралі не апошнюю ролю ў тым, што мы ледзь не страцілі Беларусь. Таму мы гэта памятаем.

Мы вучылі і вучым гісторыю. І мы заўсёды будзем гатовыя абараніць нашу Айчыну і нашу зямлю!

*(Апладысменты.)*

Звяртаюся сёння да беларусаў. Як Прэзідэнт і Галоўнакамандуючы хачу вас запэўніць: мы не хочам ваяваць і не будзем ваяваць. Ніякай вайны ў сучасных умовах на тэрыторыі Беларусі не будзе, таму што гэта немагчыма!

І калі не дай бог нешта здарыцца, мы ўсе станем Брэсцкай крэпасцю. Мы будзем да апошняга салдата і чалавека-беларуса абараняць сваю зямлю, якая належыць нашым дзецям!

Мы гэта будзем рабіць, як я сказаў, у імя міру на роднай зямлі, у імя Беларусі, якую мы ствараем на фундаменце перамог, дасягненняў, вопыту і памяці нашых гераічных продкаў.

Дарагія беларусы! Жывіце спакойна, не перажывайце, гадуйце дзяцей.

Будзьце заўсёды шчаслівыя, беражыце родную зямлю і сваіх блізкіх!

Са святам, беларусы! З Днём народнага адзінства!

Меркаванні

## Калі ёсць адзінства, то нам усё пад сілу

### Разам з экспертамі разбіраем ролю і значэнне Дня народнага адзінства

Дзень народнага адзінства — свята, якое ўздымае вялікі пласт айчыннай гісторыі. З гэтым днём звязана мноства падзей. Вакол яго шмат разнастайных, часам супрацьлеглых і неадназначных меркаванняў. Пра значэнне 17 верасня ў гісторыі Беларусі вядома даўно, але беларускаму народу яшчэ патрэбны час, каб усвядоміць важнасць гэтага дня не толькі ў мінулым, але і ў цяперашнім і нават у будучым. Таму Дзень народнага адзінства — не толькі святочны дзень, але і нагода ўспомніць урокі гісторыі. Даведаліся, што думаюць лідары меркаванняў пра самае маладое дзяржаўнае свята і яго гістарычную ролю.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** расказала, што асабіста для яе азначае Дзень народнага адзінства: «Для мяне гэтае свята — любоў да роднай краіны, наша гісторыя, той цяжкі шлях, які прайшла наша краіна і наш народ. Гэта свята, калі мы адчуваем адзін аднаго душой і сэрцам. Калі мы ўсе разам думаем аб тым, што дзякуючы старэйшым пакаленням сёння маем магчымасць жыць у такой цудоўнай, выдатнай краіне. І яшчэ раз разумеем, наколькі важна нам быць разам для таго, каб жыць на сваёй зямлі, у суверэннай, незалежнай краіне». Па словах спікера, раз'яднанне народа заўсёды прыводзіць да сур'ёзных наступстваў для дзяржавы. «Усё проста. Раз'яднанне нацыі — заўсёды праблемы ў краіне. Для таго, каб краіна развівалася, каб вырашаліся ўсе праблемы і задачы, народ павінен быць адзіны. А самае галоўнае — не будзе міру і спакою там, дзе няма згоды ў грамадстве», — адзначыла Наталля Качанава.

Як падкрэсліў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ,** адзінства — гэта паказчык паспяховасці нацыі. «Калі ёсць адзінства, то нам усё пад сілу: і 1939-ы год, і Вялікая Айчынная вайна, і будаўніцтва нашай маладой дзяржавы», — адзначыў ён. Па словах Максіма Рыжанкова, для беларусаў адзінства сімвалізуе Прэзідэнт, пад кіраўніцтвам якога Беларусь аб'ядналася, каб стаць упэўненай і паспяховай краінай. «Калі б ён не накіраваў народ у адзінае рэчышча, у адчуванне адзінства перад выклікамі, калі б не накіраваў у адзінае рэчышча развіццё нашай дзяржавы, то нічога б не было», — заявіў ён. Максім Рыжанкоў таксама заўважыў, што адзінства і згуртаванасць беларускага народа дапамагло справіцца з выклікамі, якія стаялі перад краінай у 2020 годзе.

«Можна казаць, што свята стала сапраўды ўсенародным. Здавалася б, трэці год мы яго так шырока адзначаем, хаця гэтая дата добра вядомая. Асабліва ў заходніх абласцях ёсць шмат вуліц і іншых аб'ектаў, названых у гонар 17 верасня. Але трэці год адзначаем не толькі дату ўз'яднання Беларусі ў 1939 годзе пасля расстання, пасля разразання па-жывому нашай краіны і нашага народа, але яшчэ і адзінства нашага народа ў цяперашні перыяд перад агульным ворагам. Мы паказваем, што мы — маналітная нацыя, што мы адзіны народ і гатовы любым выклікам, любым пагрозам супрацьстаяць плячо ў плячо», — адзначыў **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ.**

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК** падкрэсліў, што ў аснове адзінства беларускага народа — любоў да сваёй Радзімы. «Мне вельмі падабаецца вызначэнне, чым адрозніваецца патрыятызм ад нацыяналізму. Патрыятызм — гэта любоў да свайго. Нацыяналізм — нянавісць да чужога», — сказаў ён. Уладзімір Каранік падкрэсліў, што беларуская дзяржава заўсёды будавалася на любові. «І гэта ўз'яднанне ў 1939 годзе — акт гістарычнай справядлівасці і магчымасць нашаму народу разам будаваць сваю будучыню. Любіць сваю гісторыю, ведаць свае карані і рухацца наперад», — адзначыў ён. Уладзімір Каранік таксама заўважыў, што адзінства беларускага народа праяўляецца ў тым, што ў кожным куточку краіны адчуваеш сябе як дома.

**Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА** звярнуўся да гісторыі гэтага свята: «Той Рыжскі дагавор, які раздзяліў нашу краіну, быў абсалютна не мірны, хоць яго так называюць у гісторыі. Для Беларусі ён такім не быў. Беларускія землі, сем'і разарвалі па-жывому, не спытаўшы іх саміх. Ім заявілі, што частка беларусаў будзе жыць у іншай дзяржаве. Гэта трагедыя для Беларусі. 20 гадоў частка нашых людзей жыла ва «ўсходніх крэсах». Гэта не што іншае, як рэзервацыя, дзе не было ні законаў, ні правіл . Усё беларускае забаранялася, — нагадаў ён. — Таму 17 верасня — гэта вялікае гістарычнае свята, свята справядлівасці, уз'яднання адзінай беларускай сям'і».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Балгарыі праходзяць масавыя акцыі пратэсту сельгасвытворцаў

Балгарскія сельгасвытворцы выйшлі на масавыя пратэсты ў сувязі з рашэннем урада краіны не працягваць забарону на імпарт украінскага збожжа. Пра гэта паведаміла ТАСС. На дарогі Балгарыі выйшлі трактары, камбайны і іншая цяжкая тэхніка, каб блакіраваць дарожны рух у розных раёнах краіны, у тым ліку на некалькіх пагранпераходах. «Просім прабачэння ў грамадзян і папярэджваем аб неабходнасці адкласці свае паездкі, паколькі будуць перакрытыя галоўныя дарогі па ўсёй краіне», — заявіў старшыня Балгарскага фермерскага саюза Георгій Стаянаў. Арганізатары пратэсту настойваюць на забароне экспарту ўкраінскай сельгаспрадукцыі і абяцаюць праводзіць акцыі аж да выканання сваіх патрабаванняў. Усяго ў пратэсце ўдзельнічаюць прадстаўнікі 26 грамадскіх арганізацый, якія працуюць у галіне сельскай гаспадаркі. Адзначаецца, што на 19 верасня запланавана маштабная акцыя ў Сафіі. Урад Балгарыі раней падтрымаў рашэнне Еўракамісіі не працягваць абмежаванні на ўвоз сельгаспрадукцыі з Украіны. Балгарскія сельгасвытворцы перакананыя, што такое рашэнне з'яўляецца «здрадай нацыянальным інтарэсам».

### Найбуйнейшае прэснаводнае возера Вялікабрытаніі пакрылася таксічнымі водарасцямі

Найбуйнейшае прэснаводнае возера Вялікабрытаніі Лох-Нэй, якое таксама з'яўляецца крыніцай амаль паловы запасаў прэснай вады ў Паўночнай Ірландыі, пакрылася таксічнымі водарасцямі. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на інфармацыю Sky News. Як адзначае тэлеканал, маштаб забруджвання велізарны. Прычынай атручэння возера стаў скід вады і адходаў сельскагаспадарчай дзейнасці. Гэта прывяло да распаўсюджвання смертаноснай бактэрыі. Такая сітуацыя прыводзіць да гібелі рыбы, птушак і іншых жывёл. Таксама тое, што адбылося, выклікае ў спецыялістаў апасенні наконт стану здароўя насельніцтва. Многія людзі,



якія гадамі рыбачылі тут або развівалі бізнес на беразе, больш не могуць працягваць сваю дзейнасць з-за стану вады. Сітуацыя ўскладняецца і палітычным становішчам у рэгіёне. Прычына ў тым, што Дэмакратычная юніянісцкая партыя, якая прайграла на мінулых выбарах, адмовілася працаваць над фарміраваннем новага ўрада з нацыяналістычнай партыяй «Шын Фейн», якая выйграла. Атрымліваецца, што без урада і прызначэння міністра, які адказвае за навакольнае асяроддзе, пытанне экалогіі проста няма каму ўзяць на належны кантроль.

### У індыйскім штаце Керала працягнулі закрыццё навучальных устаноў з-за распаўсюджвання віруса

У акрузе Кажыкодзэ індыйскага штата Керала з-за распаўсюджвання смяротнага віруса Ніпах улады прынялі рашэнне падоўжыць закрыццё ўсіх навучальных устаноў да 24 верасня. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал NDTV. Рашэнне аб працягу закрыцця ўстаноў звязанае з тым, што быў зафіксаваны чарговы выпадак заражэння вірусам. Нягледзячы на тое, анлайн-заняткі будуць ісці на працягу ўсяго тыдня. Міністр аховы здароўя штата Керала Віна Джордж раней паведаміла, што колькасць асоб, якія кантактавалі з заражанымі, перавысіла тысячу чалавек. Пазней, паводле інфармацыі ведамства, гэтая колькасць павялічылася яшчэ на 130. Першыя заражаныя былі зарэгістраваныя тыдзень таму.

## КОРАТКА

- **Кіраўнік МЗС Беларусі Алейнік прыме ўдзел у 78-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Ёрку.**
- З пачатку года амаль 329 тыс. іншаземцаў скарысталіся беларускім бязвізам.
- **«Беларуснафта» свідруе першую пошукавую свідравіну ў Лельчыцкім раёне.**
- «АМКАДОР» прадставіў тэхніку на выставе «БУДДАРЭКСПА» ў Чувашыі.
- **Больш за 5,5 тыс. школьнікаў атрымалі падтрымку ў рамках акцыі «У школу з добрым сэрцам».**
- У Беларусі намалочана амаль 74 тыс. тон зерня кукурузы.

Адукацыя

## КОНКУРС ПРАФЕСІЙНАЙ СІЛЫ ДУХУ

**«Я магу быць актрысай, спявачкай, пісьменнікам, сцэнарыстам, прадзюсарам і нават дызайнерам. Журналістам, пастаноўшчыкам, загадкавай істотай. Але я не чараўнік, я — настаўнік! Любіць, навучаць, матываваць. Слухаць і быць праваднікам, натхняць, дапамагаць — мая місія». Менавіта так апісала сутнасць сваёй прафесіі настаўніца англійскай мовы з пінскай гімназіі № 2 Вольга ШЧАРБАКОВА. Яе педагагічнае крэда: самае важнае ў адукацыі — чалавек. Яна і яшчэ 55 найлепшых педагогаў з усіх рэгіёнаў краіны ў найбліжэйшыя дзесяць дзён будуць прэзентаваць свой педагагічны вопыт у фінале Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь 2023», які ўрачыста адкрыўся ў сценах Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.**

Конкурс праводзіцца раз на тры гады ў чатыры этапы: школьны, раённы, абласны і рэспубліканскі па васьмі прадметных намінацыях. Сярэдні стаж педагагічнай



Фота Лізаветы ГОЛАД.

дзейнасці фіналістаў — 15,5 года. Пятнаццаць педагогаў маюць стаж да дзесяці гадоў, 27 педагогаў — да 20 гадоў і 13 педагогаў — да 30 гадоў. Найбольшы стаж работы (31 год) у настаўніка біялогіі са слуцкай гімназіі № 1 Іны Хаўстовіч.


СТАР. 2



ISSN 1990 - 763X



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!